3. *Белецкий А.* Виленский учебный округ в XIX в. // Виленский календарь на 1904 простой год царствования Императора Николая II. Вильна, 1903. С. 76.
4. Однодневная перепись начальных школ в Империи, произведенная 18 января 1911 г. СПб., 1916. Вып. 16. Диаграммы и картограммы.
5. Положение об особых преимуществах гражданской службы в отдельных местностях, а также в губерниях западных и Царства Польского. Изд. 1896 г.. // Свод Законов Российской империи (неофиц. издание). Все 16 томов со всеми относящимися к ним продолжениями в одной книге. СПб., 1899. Т. 3. Свод уставов о службе гражданской. Кн. 3. С. 198—199.
6. Высочайшее повеление «О расширении власти попечителей учебных округов» от 12 октября 1906 г. // Циркуляр по Виленскому учебному округу. 1906. № 12. С. 568.
7. *Круковский А.* Очерки педагогического прошлого в Северо-Западном крае // Журнал Министерства народного просвещения. 1917, февраль, июль, август, сентябрь. С. 90—95.
8. Учительская взаимопомощь в Виленском учебном округе // Народное образование в Виленском учебном округе. 1913. № 2. С. 138—142.
9. Пачынальнікі. З гіст.-літ. матэрыялаў XIX с. Мн., 1977. С. 54.
10. Документы и материалы по истории Белоруссии. (1900—1917). Мн., 1953. Т. 3. С. 281.

*SUMMARY*

*The questions, connected with the development of pedagogical system in North-West region (second part of the XIX century — beginning of the XX century) are analysed. The article illustrates the foundation of a functionally governmental model of a teacher training system.*

УДК 378(476)

*І. А. Андарала*

## АДНАЎЛЕННЕ СІСТЭМЫ ЗАВОЧНАЙ ВЫШЭЙШАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫЯ ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1944—1945 гг.)

Інтэнсіўнае аднаўленне і перспектывы развіцця школьнай сеткі рэспублікі ў першы пасляваенны год паставілі праблему забеспячэння масавай школы кваліфікаванымі настаўнікамі. Калі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў школах рэспублікі працавала 54600 настаўнікаў, то на пачатак 1944/45 навучальнага года іх налічвалася толькі 35036 чалавек [2, с. 201]. Па даных Наркамата асветы БССР дэфіцыт настаўніцкіх кадраў

у масавай школе ў 1944/45 навучальным годзе складаў 11 тыс. педагогаў [6, л. 390]. Дэфіцыт значна абвастраўся якасным саставам працуючых у школах рэспублікі настаўнікаў. З 35036 педагагічных работнікаў першага пасляваеннага навучальнага года 10814 (31 %) увогуле не мелі спецыяльнай педагагічнай адукацыі. Вышэйшую педагагічную адукацыю мелі толькі 2414 чалавек, што складала 6,9 % ад агульнай колькасці настаўнікаў масавай школы. Незакончаную вышэйшую педагагічную адукацыю мелі 3695 педагогаў. Асноўную ж масу дыпламаваных спецыялістаў складалі настаўнікі з сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыяй — 18113 чалавек. У працэнтных адносінах гэта каля 52 % [2, с. 201].

Асноўнай і адзінай прычынай значнага памяншэння колькасці і істотнага зніжэння якаснага саставу настаўнікаў рэспублікі з'явілася вайна і трохгадовая акупацыя, якая прынесла значны ўрон педагагічнай адукацыі ў цэлым і вышэйшай педагагічнай школе ў прыватнасці.

У перадваенныя гады дзякуючы палітыцы мэтанакіраванага пашырэння сеткі вышэйшых педагагічных навучальных устаноў і педагагічных тэхнікумаў, павелічэнню кантынгенту студэнтаў як стацыянарнай, так і завочнай формы навучання, з году ў год назіралася станоўчая дынаміка ў падрыхтоўцы новых кваліфікаваных педагагічных кадраў і павышэнні кваліфікацыі ўжо працуючых у школе. Так, у 1939/40 навучальным годзе на дзённых аддзяленнях у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах Беларусі навучалася 8 тыс. студэнтаў, у педагагічных тэхнікумах — 11210 навучэнцаў [5, с. 18—20]. Паляпшэнню якаснага саставу настаўніцкіх кадраў масавай школы садзейнічала штогадовае павелічэнне прыёму на завочнае аддзяленне педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў і педагагічных тэхнікумаў. У тым жа 1939/40 навучальным годзе ў вышэйшых педагагічных навучальных установах завочна атрымлівалі адукацыю і тым самым павышалі сваю кваліфікацыю 9598 ужо працуючых у сістэме адукацыі настаўнікаў [5, с. 18—20].

Як вынік палітыкі, што праводзілася ў галіне падрыхтоўкі педагагічных кадраў, толькі ў 1939 г. школы рэспублікі папоўніліся 4328 маладымі настаўнікамі. 1726 (30 %) з іх з'яўляліся выпускнікамі педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў [3, с. 37].

Прыведзеныя статыстычныя даныя дазваляюць выканаць простыя арыфметычныя падлікі. З прычыны поўнага закрыцця, у сувязі з вайной і акупацыяй, вымушанага трохгадовага бяздзеяння педагагічныя навучальныя ўстановы рэспублікі недападрыхтавалі, а школы недаатрымалі каля 13 тыс. маладых дыпламаваных настаўнікаў. Да гэтага паказчыка неабходна дадаць страты настаўніцкіх кадраў на франтах і ў партызанскіх атрадах.

Акрамя таго, за час акупацыі не змаглі павысіць сваю кваліфікацыю праз сістэму завочнай падрыхтоўкі яшчэ прыкладна 5 тыс. ужо працуючых у масавай школе настаўнікаў, што прывяло да зніжэння якаснага саставу педагагічных кадраў.

Неабходна адзначыць, што пытанне пра аднаўленне дзейнасці педагагічных навучальных устаноў рэспублікі было пастаўлена яшчэ ў 1942 г., г. зн. задоўга да вызвалення тэрыторыі Беларусі. Менавіта тады было прынята рашэнне ЦК КП(б)Б аб водзыве з радоў Чырвонай Арміі, партызанскіх атрадаў і накіраванні ў распараджэнне Наркамата асветы рэспублікі былых работнікаў вышэйшых навучальных устаноў. Перад імі ставілася задача — распрацаваць комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні ВНУ рэспублікі, у т. л. педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў. У лістападзе — снежні вялікая група адазваных спецыялістаў пад кіраўніцтвам Наркамата асветы Беларусі пачала актыўную падрыхтоўчую працу па аднаўленні вышэйшай педагагічнай школы.

Важнае месца ў падрыхтоўцы настаўнікаў пасляваеннага перыяду адводзілася і завочнай форме адукацыі педагагічных кадраў. На гэта арыентавала Пастанова Савета Народных Камісараў СССР «Аб мерапрыемствах па ўмацаванні сістэмы завочнай педагагічнай адукацыі», прынятая 18 снежня 1943 г. № 1398 [10]. Саўнаркам СССР абавязаў Саўнаркамы рэспублік распрацаваць да 1 студзеня 1944 г. мерапрыемствы па ўмацаванні сістэмы завочнай педагагічнай адукацыі, прадугледзеўшы арганізацыю пры педагагічных і настаўніцкіх інстытутах аддзяленняў завочнага навучання, вызначыць планы прыёму на гэтыя аддзяленні.

Да аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі, у т. л. і вышэйшых педагагічных навучальных устаноў, народ Беларусі, як і народы іншых саюзных рэспублік, прыступіў яшчэ ў час вайны, па меры вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку самаадданай працы ўсяго насельніцтва да пачатку 1944/45 навучальнага года аднавілі сваю дзейнасць 5 педагагічных і 8 настаўніцкіх інстытутаў.

Першай вышэйшай педагагічнай навучальнай установай, што пачала функцыянаваць у Беларусі ў пасляваенны год, быў Рагачоўскі настаўніцкі інстытут. На жаль, разбураныя вучэбныя корпусы інстытута не дазвалялі арганізаваць вучэбны працэс у г. Рагачове. Па гэтай прычыне 15 сакавіка 1944 г. дзейнасць Рагачоўскага настаўніцкага інстытута аднавілася ў г. Мазыры. Колькасць студэнтаў склала 210 чалавек [8, л. 10—12].

Выключна важнай падзеяй у жыцці педагагічнай грамадскасці Беларусі і ў вырашэнні праблемы падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў з'явілася прыняцце Саветам Народных Камісараў БССР 29 ліпеня 1944 г. пастановы аб аднаўленні дзейнасці Мінскага дзяржаўнага педагагічнага і настаўніцкага інстытута

імя М. Горкага. Вочнае аддзяленне аднаўленага педінстытута ўключала пяць факультэтаў: мовы і літаратуры, гістарычны, замежных моў, педагагічны (аддзяленне дашкольнай і школьнай педагогікі) і бібліятэчны. Настаўніцкі інстытут аб'ядноўваў два факультэты: мовы і літаратуры і замежных моў. Разам са стацыянарам аднавіла працу і завочнае аддзяленне. Яно ўключала гістарычны факультэт і факультэт мовы і літаратуры, які складаўся з двух аддзяленняў: рускай мовы і літаратуры і беларускай мовы і літаратуры. Вышэйназванай пастановай быў вызначаны і план прыёму на 1944/45 навучальны год: у педагагічны інстытут — 450 чалавек; настаўніцкі — 250 чалавек. На завочнае аддзяленне планавалася прыняць у педагагічны — 650, у настаўніцкі — 250 чалавек [8, л. 1—2].

Такім чынам, у выніку мерапрыемстваў, праведзеных Наркаматам асветы БССР, да пачатку 1944/45 навучальнага года на тэрыторыі рэспублікі была адноўлена дзейнасць усёй даваеннай сеткі вышэйшых і сярэдніх педагагічных навучальных устаноў.

Аднак, нягледзячы на прынятыя меры па аднаўленні дзейнасці педагагічных навучальных устаноў, неабходнасць рэспублікі ў настаўніцкіх кадрах працягвала заставацца дастаткова вострай.

Больш таго, ва ўмовах завяршэння пераходу да ўсеагульнага пачатковага навучання, а ў перспектыве з 1949 г. пераходу да ўсеагульнага абавязковага сямігадовага навучання прагназаваўся значны рост сеткі школ. Гэты факт даваў падставу меркаваць, што праблема настаўніцкіх кадраў, асабліва настаўнікаў для 5—7 і 8—10 класаў, у бліжэйшыя гады не толькі не знімецца, а яшчэ больш абвастрыцца. Абставіны прадугледжвалі прыняцце шэрага неадкладных і канкрэтных мер па развіцці вышэйшай педагагічнай школы. Як паказала практыка, адну з такіх першачарговых мер Савет Народных Камісараў Беларускай ССР бачыў у развіцці сістэмы завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі. Як пацвярджэнне гэтаму, 9 кастрычніка 1944 г. СНК рэспублікі прыняў пастанову за № 655 «Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі» [9, л. 246]. У адпаведнасці з гэтай пастановай пры ўсіх педагагічных і настаўніцкіх інстытутах рэспублікі ўводзіліся завочныя аддзяленні. Для практычнай рэалізацыі гэтай пастановы ўрад абавязаў Наркамфін БССР выдаткаваць Наркамату асветы рэспублікі неабходныя асігнаванні на аднаўленне сеткі завочнага навучання настаўнікаў.

Сваёй пастановай СНК БССР абавязаў усіх настаўнікаў, якія не мелі неабходнай педагагічнай адукацыі, закончыць завочныя педагагічныя навучальныя ўстановы ў наступныя тэрміны:

- настаўнікам 5—7 класаў закончыць настаўніцкія інстытуты да першага жніўня 1946 г.;
- настаўнікам 8—10 класаў закончыць педагагічныя інстытуты

або універсітэты да 1 жніўня 1948 г.

Пастанова ўрада прадугледжвала шэраг істотных ільгот для настаўнікаў-завочнікаў. У прыватнасці, ім кампенсаваліся затраты за праезд на сесію і з сесіі, а тыя, хто займаўся здавальняюча, вызваляліся ад платы за навучанне.

Наркамат асветы рэспублікі дазволіў штогод расходаваць да 1 % ад выдаткаваных на павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў сродкаў на прэміраванне лепшых па арганізацыі завочнага навучання раённых аддзелаў народнай адукацыі, школ, настаўніцкіх і педагагічных інстытутаў. У штат аддзела народнай адукацыі ўводзілася пасада інспектара па завочным навучанні.

Сваёй пастановай СНК БССР абавязаў Наркамат асветы рэспублікі:

- забяспечыць праз мясцовыя органы народнай адукацыі не радзей як 1 раз у 3 месяцы персанальную праверку выканання вучэбных заданняў настаўнікамі-завочнікамі;
- арганізаваць з 10 кастрычніка 1944 г. кансультацыйныя пункты для настаўнікаў-завочнікаў з разліку адзін пункт на 200 чалавек. Абслугоўванне кансультацыйных пунктаў забяспечыць прафесарска-выкладчыцкім саставам вышэйшых педагагічных навучальных устаноў;
- арганізаваць з 1 студзеня 1945 г. пры абласных, раённых бібліятэках, бібліятэках вышэйшых навучальных устаноў бібліятэчкі-перасоўкі для абслугоўвання настаўнікаў-завочнікаў, што пражывалі ў аддаленых раёнах.

Пастанова ўрада абавязвала Наркамат асветы БССР і камітэт па радыёфікацыі і радыёвяшчанні пры Саўнаркаме БССР арганізаваць праз цэнтральныя і мясцовыя радыёстанцыі перадачы для настаўнікаў-завочнікаў лекцый і кансультацый.

З мэтай рэалізацыі вышэйназванай пастановы Савета Народных Камісараў БССР Наркамат асветы рэспублікі выдаў загад № 161 ад 18 лістапада 1944 г. «Аб аднаўленні сеткі завочнай педагагічнай адукацыі» [12, л. 18—20], у адпаведнасці з якім загадчыкам абласных аддзелаў народнай адукацыі неабходна было не пазней чым 15 лістапада 1944 г. праверыць састаў настаўнікаў 1—4 і 5—10 класаў пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ, абавязаных атрымаць неабходную адукацыю і не залічаных да гэтага тэрміну на завочнае аддзяленне. Загад абавязваў абласныя аддзелы народнай адукацыі высветліць персанальную прычыну адмаўлення ад завочнага навучання, падаць спісы неахопленых завочнай адукацыяй настаўнікаў у настаўніцкія і педагагічныя інстытуты і забяспечыць іх паступленне ў 1944/45 навучальным годзе. Настаўнікі, што паступілі на завочныя аддзяленні ў 1944 г., павінны былі з'явіцца на ўстаноўчую сесію ў тэрміны, устаноўленыя адпаведнымі педагагічнымі навучальнымі ўстановамі сумесна з Аблана.

Загад № 214 Наркамата асветы ад 28 лістапада 1945 г. «Аб мерапрыемствах па ўмацаванні завочнай адукацыі ў рэспубліцы» патрабаваў вызваляць ад працы ў школе настаўнікаў, якія ўхіляліся ад завочнага навучання і не выконвалі вучэбных заданняў адпаведнай навучальнай установы без уважлівых прычын [8, л. 64].

Дырэктарам педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў загадвалася:

- устанавіць тэрміны прыёму заяў ад паступаючых на завочнае навучанне да 1 снежня 1944 г.;
- правесці для настаўнікаў, прынятых на завочнае навучанне, устаноўчую сесію.

У адпаведнасці з загадам, перад Упраўленнем Вышэйшай школы НКА БССР ставілася задача — забяспечыць завочныя аддзяленні вучэбнымі планамі, праграмамі і метадычнымі ўказаннямі.

Гэтым жа загадам зацвярджалася сетка завочных аддзяленняў пры педагагічных і настаўніцкіх інстытутах рэспублікі і даводзіўся план прыёму студэнтаў-завочнікаў. На 1944/45 навучальны год ён склаў 1150 чалавек у педінстытуты і 1650 чалавек у настаўніцкія інстытуты [8]. План прыёму на завочныя аддзяленні па педагагічных навучальных установах рэспублікі ў 1944/45 навучальным годзе адлюстраваны ў табліцах 1—2.

*Табліца 1*

**План прыёму на завочныя аддзяленні педагагічных інстытутаў БССР у 1944/45 навучальным годзе**

| № п/п | Назва педагагічнага інстытута | План прыёму, чалавек |
|---|---|---|
| 1 | Мінскі педагагічны інстытут | 350 |
| 2 | Віцебскі педагагічны інстытут | 200 |
| 3 | Магілёўскі педагагічны інстытут | 200 |
| 4 | Гродзенскі педагагічны інстытут | 200 |
| 5 | Гомельскі педагагічны інстытут | 200 |
| | *Усяго* | *1150* |

*Табліца 2*

**План прыёму на завочныя аддзяленні настаўніцкіх інстытутаў БССР у 1944/45 навучальным годзе**

| № п/п | Назва настаўніцкага інстытута | План прыёму, чалавек |
|---|---|---|
| 1 | Баранавіцкі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 2 | Віцебскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 3 | Гомельскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 4 | Мінскі настаўніцкі інстытут | 250 |
| 5 | Магілёўскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 6 | Мазырскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 7 | Аршанскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| 8 | Пінскі настаўніцкі інстытут | 200 |
| | *Усяго* | *1650* |

Парадак залічэння студэнтаў на завочныя аддзяленні педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў і афармленне студэнцкай дакументацыі ў першы пасляваенны навучальны год здзяйсняўся ў адпаведнасці з правіламі прыёму [8, л. 53], якія прадугледжвалі, што яно праводзілася загадам па навучальнай установе на падставе ўстаноўленых дакументаў (заліковых кніжак, выдадзеных ВНУ даведак аб пераводзе з курса на курс, выпісак з загадаў па ВНУ, студэнцкіх білетаў, а таксама дакументаў, якія сведчылі аб навучанні студэнтаў на тым або іншым курсе).

Залічэнне дазвалялася ажыццяўляць таксама на падставе даведак, выдадзеных дырэктарам ВНУ, яго намеснікам па вучэбнай і навуковай працы, дэканам факультэта, або даведкі, выдадзенай двума выкладчыкамі ВНУ ці факультэта, на якім навучаўся студэнт.

Студэнты, якія не падалі пералічаныя дакументы, але дамагаліся права навучання ў ВНУ на пэўным факультэце і курсе, павінны былі ва ўстаноўленыя тэрміны здаць экзамены па прафілюючых прадметах дадзенага факультэта і курса, калоквіумы — па астатніх дысцыплінах мінулых гадоў.

Асобы, што не выканалі вышэйпералічаных патрабаванняў, мелі права залічэння толькі на першы курс адпаведнага факультэта.

Тым не менш, нягледзячы на значную растлумачальную і агітацыйную працу з боку абласных, раённых аддзелаў народнай адукацыі, кіраўнікоў школ, мерапрыемствы вышэйшых педагагічных навучальных устаноў (інфармаванне праз перыядычны друк, радыёвяшчанне пра аднаўленне дзейнасці завочных аддзяленняў педагагічных ВНУ і правілах прыёму, выезды кіруючых работнікаў і выкладчыкаў навучальных устаноў ў розныя раёны рэспублікі для правядзення растлумачальнай работы сярод настаўнікаў, якія не мелі адпаведнай педагагічнай адукацыі), першы пасляваенны план набору на завочную форму падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў выканаць не ўдалося.

Працэнт яўкі студэнтаў-завочнікаў на першую ўстаноўчую сесію быў яшчэ ніжэйшым. Аб гэтым яскрава сведчаць даныя справаздачы аб выніках устаноўчай сесіі завочнікаў Мінскага педагагічнага і настаўніцкага інстытутаў, якая адбылася ў перыяд з 21 па 28 лютага 1945 г. [11]. Колькасныя даныя яўкі на сесію прыведзены ў табліцах 3—4.

*Табліца 3*

**Звесткі пра яўку студэнтаў-завочнікаў Мінскага педагагічнага інстытута на ўстаноўчую сесію 1944/45 навучальнага года**

| Факультэт і курс | Усяго на 21.02.45 выклікана на сесію | Фактычна з'явілася на сесію | % яўкі |
|---|---|---|---|
| Гістфак | 114 | 56 | 49 |
| I курс | 89 | 43 | 41 |
| II курс | 5 | 4 | 80 |
| III курс | 11 | 4 | 37 |
| IV курс | 9 | 5 | 62 |
| Літфак | 317 | 172 | 54 |
| I курс | 181 | 93 | 51 |
| II курс | 63 | 33 | 52,5 |
| III курс | 58 | 37 | 64 |
| IV курс | 15 | 9 | 60 |

*Табліца 4*

**Звесткі пра яўку студэнтаў-завочнікаў Мінскага настаўніцкага інстытута на ўстаноўчую сесію 1944/45 навучальнага года**

| Курс | Усяго на 21.02.45 выклікана на сесію | Фактычна з'явілася на сесію | % яўкі |
|---|---|---|---|
| I курс | 153 | 145 | 95 |
| II курс | 32 | 21 | 65 |
| Па інстытуту | 185 | 166 | 90 |

Як бачна з табліц 3—4, з 431 студэнта-завочніка Мінскага педагагічнага інстытута на ўстаноўчую сесію з'явілася 288 чалавек.

У працэнтных адносінах гэта склала толькі 51,5 %. Яўка студэнтаў-завочнікаў Мінскага настаўніцкага інстытута была крыху вышэйшай — 166 чалавек са 185 выкліканых на сесію.

У цэлым па Мінскім педагагічным і настаўніцкім інстытутах яўка на першую пасляваенную ўстаноўчую сесію склала 64 %. Прыкладна такое ж становішча было і ў астатніх педагагічных і настаўніцкіх інстытутах Беларусі.

*ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ*

1. Витебский государственный педагогический институт: Крат. ист. очерк. Мн., 1979.
2. *Ильюшин И. М., Умрейко С. А.* Народное образование в Белорусской ССР. Мн., 1961.
3. Культурное строительство БССР. Мн., 1940.
4. *Пейсахович А. Я.* Культурное строительство в БССР в 1943—1945 гг. Мн., 1961.
5. Статистический справочник состояния народного хозяйства и культуры БССР к началу Великой Отечественной войны. Изд. СНК БССР, 1943.

6. НА РБ, ф. 4, воп. 17, д. 21.
7. НА РБ, ф. 42, воп. 4, д. 120.
8. НА РБ, ф. 42, воп. 4, д. 262.
9. НА РБ, ф. 42, оп. 4, д. 266.
10. НА РБ, ф. 42, воп. 4, д. 277.
11. НА РБ, ф. 42, воп. 4, д. 298.
12. НА РБ, ф. 746, воп. 1, д. 4.

*SUMMARY*

*The conditions of development of part-time pedagogical education during post-war period (1944—1945) are analysed.*

УДК 373.21

*Н. С. Старжынская*

# ПРАБЛЕМА МЕТАДЫЧНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ І НАВУЧАННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ РУСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ МОВАМ

Развіццё маўлення і маўленчых зносін — адна з галоўных задач выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах дзіцячага сада. Маўленчае развіццё дашкольнікаў у Беларусі адбываецца ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага двухмоўя. «Справа не толькі ў генетычнай роднасці,— адзначаў вядомы беларускі лінгвіст і педагог А. Я. Супрун,— а ў гранічнай блізкасці сістэм беларускай і рускай моў, якая выпрацавалася на базе генетычнай роднасці ў выніку ўзаемных уплываў і паралельнага развіцця некаторых элементаў». Генетычная і псіхалагічная (з боку эмацыянальнага стаўлення да абедзвюх моў) блізкасць стварае спецыфічныя ўмовы для авалодання дзецьмі руска-беларускім двухмоўем.

Для большасці дзяцей першай мовай, на якой яны вучацца размаўляць і думаць, мець зносіны з акалючымі іх людзьмі, з'яўляецца руская. Беларуская мова, да якой дзеці далучаюцца хоць і даволі рана, у дашкольным узросце, выступае для іх як другая.

Для меншай часткі дзяцей, галоўным чынам у сельскай мясцовасці, першай мовай з'яўляецца беларуская, часта не літаратурная, а змешаная з рускай, засмечаная памылкамі інтэрферэнцыі (так званая трасянка). Гэтыя дзеці знаёмяцца ў дашкольнай установе з рускай мовай, аднак іх маўленне часцей за ўсё цяжка аднесці да якой-небудзь адной моўнай сістэмы. Так, аса-